# *ТОЛЬКІ ПАЧАТАК*



**19 снежня ў офісе Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ на апошнія заняткі ў адыходзячым годзе сабраліся слухачы створанай нашай пісьменніцкай арганізацыяй Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы. Сабраліся каб больш падрабязна пазнаёміцца з асаблівасцямі *выдавецкай справы*. Менавіта такой была тэма сустрэчы.**

Сярод тых, хто прыйшоў на занятак, былі члены СПБ, гарадскога літаратурнага аб'яднання "Надежда", журналісты, літаратары-аматары. У ролі выкладчыка нашай літшколы на гэты раз пагадзіўся выступіць добра вядомы ў нашым горадзе чалавек, дырэктар кніжнага выдавецтва "ЮрСаПрынт" Аляксандр Аляксандравіч Рыжы. На жаль, аўдыторыю можна ахарактарызаваць як нешматлікую. Гэта гаворыць аб тым, што ў свядомасці людзей кнігавыданне па-ранейшаму вырашаецца вельмі проста – з дапамогай грошай. Нагадаем: пару гадоў таму, нягледзячы на сваю занятасць, Аляксандр Аляксандравіч Рыжы ўжо прымаў удзел у дыскусіі на тэму "Як жывеш, кніга?" ў рамках пасяджэння грамадскага дыскусійнага клуба “Словадром”. З гутарак з А. А. Рыжым можна зрабіць выснову, што кніга па сутнасці сваёй працягвае балансаваць паміж роляй тавару і ганарлівым статусам сакральнай каштоўнасці. Толькі як знайсці паміж двума гэтымі паняццямі здаровы кампраміс, рацыянальнае звяно? Усё залежыць ад кан'юнктуры рынку і што самае галоўнае – ад узроўню агульнай культуры насельніцтва, якое стварае попыт на тую ці іншую кніжную прадукцыю.



А.А.Рыжы падзяліўся некаторымі неадназначнымі, праблемнымі момантамі ў супрацоўніцтве з аўтарамі; распавёў пра тое, як аўтар можа спрасціць задачу выдаўцу; пералічыў найбольш частыя памылкі ў падрыхтоўцы рукапісу да выдання. Што і казаць, акрамя іншых праблем, выдавецкая граматнасць нашых літаратараў пакідае жадаць лепшага. Напрыклад, вельмі дзіўна і нават прыкра бывае часам чуць ад людзей, якія звярнулі ўвагу на абвешчаны абласны конкурс рукапісаў імя Цёткі зусім нечаканыя пытанні: “Што такое рукапіс – адзін твор або некалькі?” З выступлення выдаўца таксама можна было даведацца, як і чым жыве сёння паліграфічная прамысловасць, з якімі перашкодамі даводзіцца сутыкацца выдавецкай справе і чаму паліграфічнае прадпрыемства, якое ён узначальвае, мяняе сваю назву і зусім хутка будзе называцца "ЛітАРы". Аляксандр

Аляксандравіч выказаў зацікаўленасць у пастаяннай увазе і экспертна-рэдактарскай падтрымцы з боку Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Таму што да чытача павінна трапляць кніжная прадукцыя толькі высокай мастацкай якасці, сапраўды вартага грамадскай увагі зместу. А дамагчыся гэтага можна толькі сумеснымі намаганнямі выдаўцоў і філолагаў, знаўцаў літаратуры, яе гісторыі, тэорыі, філасофіі, мастацтвазнаўцаў, прадстаўнікоў пісьменніцкіх арганізацый.



І слухачы Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы праявілі цікавасць да сказанага прафесійным экспертам. Выдавец імкнуўся адказаць на ўсе ўзнікшыя пытанні. Людзей цікавіла, напрыклад, тое, чаму прыватнае выдавецтва ў большай ступені акцэнтуецца на мясцова-гістарычнай тэматыцы. (Няўжо нашай айчыннай гісторыяй працей гандляваць?) Аляксандр Аляксандравіч тлумачыць гэта павышэннем цікавасці да кнігі гістарычнага, краязнаўчага характару ва ўсёй рэспубліцы. Аднак самым галоўным з агучаных тэзісаў варта прызнаць выснову аб тым, што выдавецкая справа не абмяжоўваецца толькі працэсамі набору зместу і друкавання кніжнага накладу. “Выдавец – гэта не толькі друкар, – падкрэсліў Аляксандр Рыжы, – а выхад кнігі з друку – гэта толькі пачатак нашай агульнай працы”. Было сказана аб тым, што адбываецца і што павінна адбывацца адразу пасля выхаду кнігі ў свет. А менавіта яе рэклама, распаўсюджанне, знаёмства з ёй яе патэнцыйных чытачоў і вядома, продаж. Сутнасць сказанага змяшчаецца ў самім слове "*выданне*". Адказнасць за лёс кнігі ў роўнай ступені ляжыць як на выдаўцы, так і на самым аўтары, адзначыў эксперт.




Можна колькі заўгодна спрачацца з тым, у чым заключаецца функцыя аўтара кнігі, але падобныя спрэчкі будуць мець карысць адносную. Адно ясна дакладна: нам усім неабходная перабудова нашай свядомасці. На дадзеным гістарычным вітку існавання кнігі ўсё вельмі нагадвае нейкі рэнесанс, калі чалавецтва толькі пачынае выходзіць са змроку састарэлага дагматычнага мыслення да новых гарызонтаў, новых ісцін. Адна з іх: літаратурная справа і кнігавыданне фактычна адно цэлае; усё гэта творчасць. І ўсе мы павінны адкінуць забабоны і дамагацца агульнай мэты агульнымі намаганнямі. Так, гэта няпроста – напісаць годны тэкст і прыцягнуць да яго ўвагу грамадскасці, стварыць попыт на кнігу. Але без гэтага немагчымая будучыня літаратуры. Нам усім неабходны пераход на новы ўзровень існавання ў сістэме каштоўнасцяў. Не выключана, што цана на кнігі ў бліжэйшыя гады вырасце ў дзясяткі ці нават у сотні разоў. Кніга стане чымсьці з разраду суперновай інтэлектуальнай, духоўнай і эстэтычнай спадчыны чалавека, сродкам нашай самаідэнтыфікацыі, сімвалічным маркерам нашай цывілізацыі. Толькі так – радыкальнымі зрухамі ў свядомасці людзей можна забяспечыць усім нам, нашай агульнай справе нейкую перспектыву.

***

Як быццам у пацвярджэнне сказанага А. А.. Рыжым, гутарку на тэму “Выдавецкая справа” ў якасці дасведчанага эксперта працягнула празаік з Гродна Кацярына Насута. Не першы год маладая жанчына паспяхова рэалізуе свае творчыя здольнасці ў стварэнні так званай камерцыйнай літаратуры. Дастаткова ўвесці ў графу Інтэрнэт-пошукавіка адзін з яе псеўданімаў (*Карина Дёмина*, *Екатерина Лесина*), каб ацаніць узровень працаздольнасці пісьменніцы, аўтара каля сотні кніг, выпушчаных расійскімі выдавецтвамі. Супрацоўнічала наша зямлячка таксама і з беларускімі, і з украінскімі выдавецкімі прадпрыемствамі. Калі слухаеш аповяд Кацярыны, разумееш, што для падобных вынікаў, акрамя творчых здольнасцяў і ідэальнага валодання стылістыкай літаратурнай мовы, неабходныя іншыя важныя ўмовы – вольны час, спакой, натхненне, псіхалагічная канцэнтрацыя…




Калі знаёмішся з працамі Кацярыны – фэнтэзі, прыгодніцкай і дэтэктыўнай прозай – бачыш, наколькі шырокім павінен быць кругагляд аўтара, наколькі разнапланавымі ведамі неабходна карыстацца ў працэсе стварэння таго ці іншага персанажа, фарміравання сюжэту. Жыццёвыя сітуацыі, а таксама перыпетыі фантастычных сюжэтаў патрабуюць праўдападабенства, дакладнасці і гарманічнасці. І яшчэ абавязкова эстэтычны густ! Толькі ў выпадку выканання гэтых умоў, дасягнення гэтых крытэраў чытач, што называецца, прагаласуе рублём.

“Чым адрозніваецца работа камерцыйнага аўтара з буйнымі холдынгамі: пытанні вокладкі, пытанні распаўсюджвання, продажу мяне не тычацца ўвогуле. – прызнаецца Кацярына, – Гэта той выпадак, калі я паслала рукапіс, мне прыходзіць дагавор, я яго падпісваю, праз некаторы час я атрымліваю ганарар, і ў мяне пытаюцца: калі наступная?" Аповед пісьменніцы складаўся з масы цікавых дэталяў, якія карысна было б даведацца многім. Як аказалася, цяпер аўтару можна прадаць кнігу нават у працэсе напісання. Кацярына Насута падзялілася каштоўным асабістым вопытам устанаўлення кантактаў і супрацоўніцтва з камерцыйнымі выдавецтвамі, дзе немалаважнымі фактарамі з'яўляюцца адэкватная ацэнка сваіх магчымасцяў і асабістыя зносіны з рэдактарамі. Эксперт грамадскай літшколы распавяла, пра тое, што такое сінопсіс, аўтарскі брэнд, электроннае тыражаванне, правілы серыі (шчаслівы фінал, пастаянныя героі), аўтарскія хвалі і іншае. Сярод адмоўных тэндэнцый у сучаснай камерцыйнай літаратуры гродзенская пісьменніца цалкам справядліва адзначае прапаганду гвалту ў мастацкіх сюжэтах. Выступленне Кацярыны Насуты, як і выдаўца Аляксандра Рыжага, было б вельмі каштоўна яшчэ раз пачуць больш шырокай аўдыторыі.

Снежаньскія заняткі Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы на тэму “Выдавецкая справа” пераканалі нас у тым, што экспертаў у справе літаратурнай творчасці, выдання кніг ды іншых справах можна знайсці ў блізкім коле нашых сяброў і калегаў. Трэба толькі, каб супалі час, месца, жаданне і магчымасці для нашых сустрэч. Чаго і ўсім жадаем у надыходзячым 2020 годзе.

***ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА***

***На фота:*** у створанай нашай пісьменніцкай арганізацыяй Гродзенскай грамадскай літаратурнай школе ідзе гутарка на тэму “Выдавецкая справа”. Офіс СПБ у Гродне, 19 снежня 2019 года.




ГРАМАТА






ПАРТРЭТ
NEW YORK
PARIS




NEW YORK
PARIS
AVEC TOI






***Фота:*** Анатоль Апанасевіч